**УДК 726.03**

# ТАЯМНІЦА ЗНІКЛАЙ СВЯТЫНІ: МАНАСТЫР СВЯТОЙ БАГАРОДЗІЦЫ Ў ПОЛАЦКУ

***д-р гіст. навук, праф. Д.У. ДУК***
**Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт**

*Прапануецца адказ на пытанне аб размяшчэнні заснаванага Еўфрасінняй Полацкай у XII ст. мужчынскага Багародзіцкага манастыра. Выказваецца меркаванне аб тым, што Барысаглебскі манастыр на Бельчыцы, шырока вядомы ў пісьмовых крыніцах XII–XVIII стст., і загадкавы манастыр у гонар св. Багародзіцы, заснаваны ў Полацку Прападобнай Еўфрасінняй у XII ст., з'яўляюцца адным і тым жа.*

Паводле жыція Еўфрасінні Полацкай, адразу пасля будаўніцтва царквы ў гонар Святога Спаса ў жаночым манастыры, ігумення задумала будаўніцтва другога мураванага храма ў заснаваным ею мужчынскім манастыры: "Видевши же преподобная Еуфросиниа манастырь свой украшен и всего блага испольнен, умысли создати вторую церковь камену Святей Богородици. И ту свершивши и иконами украси, и освятивъши, предаст ю мнихом, и бысть монастырь велий. Видевши же блаженная манастыря два устроена превелика зело и пребогата, и рече в собе: "Слава Тобе, Владыко, благодарю Тя, Святый! Что есмь восхотела, то дал ми еси, и скончал еси, Господи, желание сердца моего". И паки рече: "Помилуй мя, Господи, и скончай прошение мое, да бых видела пресвятую Богородицю Одигитрию в сей святей церкви… Сама же блаженнаа Еуфросиниа, положивши великое устроение обема манастырема, братии и сестрам, и даст дръжати и рядити сестре своей Евдокеи оба манастыря. Сама же, поклонившися в церкви Святаго Спаса и у Святое Богородици и рече: "Господи Сердцевидче! Се оставляю дом Твой незатворен никомуже; Ты же, Господи, не затвори от нас Небеснаго Ти Царствия" [5, с. 37].

Такім чынам, перад зыходам у Святую зямлю Еўфрасіння "украси же всю землю Полотскую своима боголепныма манастырема". Адзін з гэтых манастыроў – Спаса-Еўфрасіннеўскі – захаваўся да нашага часу і з'яўляецца найвялікшай праваслаўнай святыняй Беларусі. Гісторыя другога манастыра ў іншых пісьмовых крыніцах не згадваецца.

Атрымоўваецца, што заснаваны ў XII ст. Багародзіцкі манастыр па невядомых прычынах знікае са старонак пісьмовых крыніц і ўвогуле з полацкай гарадской прасторы.

Паколькі ў жыціі не пазначаецца месца, дзе быў заснаваны мужчынскі Багародзіцкі манастыр з як мінімум адным мураваным храмам, вельмі спакуслівa было б знайсці яго сляды метадамі археалагічнай разведкі. На тэрыторыі Полацка археолагамі былі знойдзены сляды мураваных цэркваў XII ст. у розных частках горада, але ніводная з іх не атаясамляецца гісторыкамі з аднайменным манастыром. Аднак ці магло аказацца так, што пісьмовыя крыніцы, акрамя факта заснавання Багародзіцкага манастыра ў XII ст., у наступныя стагоддзі нічога не гавораць ні аб размяшчэнні манастыра, ні аб яго статусе і ўладаннях. Ствараецца ўражанне, што існаванне манастыра было спынена адразу пасля заснавання. Ці гэта магчыма? На нашу думку, адказ на пытанне аб гісторыі манастыра ўсё ж такі можна знайсці ў пісьмовых крыніцах XII–XVII стст.

Нагадаем, што паводле археалагічных даных і звестак пісьмовых крыніц у часы жыцця Еўфрасінні ў Полацку існавалі два манастыры. Адзін – гэта жаночы манастыр у Сяльцэ, ігуменней якой была Еўфрасіння, і другі – манастыр у Бельчыцы, размешчаны на левым беразе Дзвіны за 1,5 км ад Сафіі непадалеку ад вусця ракі Бельчыцы. На думку большасці гісторыкаў Бельчыцкі манастыр быў заснаваны Барысам Усяславічам і атрымаў назву Барысаглебскі (гістарыяграфія пытання падрабязна асветлена Л.В. Аляксеевым, заўважым толькі, што ў гістарыяграфіі манастыр яшчэ згадваецца як княжацкі [1, с. 50]). Статус "княжацкі" вызначаны па аналогіі са згаданым у летапісах княжацкім дваром у Бельчыцы, пра што гаворка пойдзе ніжэй. Вядома, што манастыр быў мужчынскі і захаваўся да пачатку XX стагоддзя.

Аднак ці магло атрымацца так, што ў жыціі прападобнай аб дзейнасці заснаванага яе родным дзядзькай манастыра нічога не было сказана? І як магло атрымацца так, што прападобнай спатрэбілася заснаваць яшчэ адзін мужчынскі манастыр, нароўні з ужо існуючым? Нарэшце чаму толькі заснаваныя Еўфрасінняй манастыры названы "аздобай Полацкай зямлі", а буйнейшы т. зв. "княжацкі" манастыр увогуле не згаданы? І чаму ў жыціі Еўфрасінні згаданы ўсе сакральныя аб'екты Полацка: Святая Сафія, старая царква-пахавальня полацкіх епіскапаў у Сяльцэ, але не згаданы Барысаглебскі манастыр?

На гэта пытанне можа быць наступны адказ – заснаваны Еўфрасінняй Багародзіцкі манастыр і манастыр на Бельчыцы з'яўляюцца адным і тым жа манастыром. Прамое пацверджанне гэтаму знойдзем у пісьмовых крыніцах XVI-XVII стст.

Так, у грамаце ад 25 чэрвеня 1511 г. Бельчыцкі манастыр двойчы называўся адначасова Багародзіцкім і Барысаглебскім: "записал тую землю со всим к манастыру на Бельчицы Пречистое Бого-

матеры и святым мучеником Борысу и Глебу” [7, с. 77]. Верагодна, у дадзеным запісе гаворка ідзе пра т. зв. Вялікі (“Безымянны” паводле П.А. Рапапорта [8]) сабор XII ст. пад назвай Прачыстай Багамацеры. Гэты сабор размяшчаўся на тэрыторыі манастыра і быў часткова археалагічна даследаваны ў XIX – XX стст. [9, с. 34]. У грамаце ад 20 снежня 1497 г. згадваецца двор з агародам каля царквы Прачыстай Багамацеры, размешчанай паблізу двара ігумена [6, с. 148]. Аднак у рэвізіі 1618 г. згадваецца “новаадбудаваная” драўляная Прачысценская царква. Яна знаходзілася побач з мураванымі напалову разбуранымі (без дахаў) цэрквамі Барысаглебскай і Пятніцкай [4, с. 321–323]. Што разумець пад тэрмінам “новаадбудаваная” – рамонт храма ці яго ўзвядзенне – магчыма высветліць толькі пасля дэтальных археалагічных раскопак. Улічваючы сацыяльна-эканамічныя рэаліі таго часу, папярэдне магчыма вызначыць усё ж такі рамонт ужо існаваўшай царквы. Да таго ж цэркваў, узведзеных у XVII ст., на тэрыторыі манастыра, паводле археалагічных даных, не было.

Л.В. Аляксееў безапеляцыйна вызначае назву Вялікага сабора XII ст. як “Успенскага”, г. зн. названага ў гонар Успення Прасвятой Багародзіцы [1, с. 81]. Яму ж належыць думка аб размяшчэнні заснаванага Еўфрасінняй манастыра Прасвятой Багародзіцы у раёне Касавер’еўскіх могілак [1, с 58].

У скарзе полацкага архіепіскапа Іасафата Кунцэвіча на паноў Корсакаў аб тым, што яны бяспраўна называлі сябе заснавальнікамі Барысаглебскага манастыра і прыўласцілі яго землеўладанні ад 25 красавіка 1618 г. літаральна (у перакладзе з польскай транслітэрацыі) пазначана: «знайшлі мы той манастыр і цэрквы спустошаныя, муры апалыя без пакрыцця і неагароджаныя, а менавіта цэрквы дзве мураваныя, адна Святых Барыса і Глеба, а другая Святой Пятніцы, трэцяя царква драўляная цяпер нанава праз мяшчан полацкіх, людзей набажных, пабудавана, названая Успення Прасвятой Багародзіцы» [10, с. 232].

Такім чынам, у пісьмовых крыніцах першай трэці XVII ст. адначасова фігуруюць назвы аднаго і таго ж храма Барысаглебскага манастыра: Прачыстай Багамацеры (Прачысценскі) і Успення Прасвятой Багародзіцы. Абедзве назвы маюць дачыненне да т. з. Вялікага сабора, які неаднаразова даследаваўся археолагамі, рэшткі якога захаваліся ў руінах на ўзроўні падмуркаў. Падкрэслім, што пісьмовыя крыніцы таго часу дасылаюць да адрозных назваў не толькі цэркваў, але і манастыра ўвогуле: так, напрыклад, у дачыненні да Бельчыцкага манастыра ўжываецца назвы не толькі “Барысаглеб”, пра што ішла гаворка вышэй, але і такая назва, як, напрыклад, “манастыр Глеба-Барыса”, а таксама “манастыр на Бельчыцы Прачыстай Божай Мацеры і Святых пакутнікаў Барыса і Глеба” (запіс 20 чэрвеня 1618 г.) [10, с. 236, 238]. У апошнім варыянце ідзе прамое ўказанне на дзве адначасова выкарыстоўваемыя назвы: Барысаглебскі і Прачысценскі (Багародзіцкі) манастыр.

Пра атаясамленне назваў абодвух манастыроў вельмі асцярожна выказаўся ў сваёй недаўняй публікацыі полацкі краязнаўца І.З. Залілаў: «где была построена церковь Богородицы и при ней устроен мужской монастырь точно сказать трудно. Существует предположение, что на территории великокняжеского двора на Бельчицах, кроме известного всем исследователям Борисоглебского мужского монастыря, существовал ещё один монастырь – Богородицкий» [3, с. 132]. Пра княжацкі двор каля тэрыторыі манастыра (на самой тэрыторыі, натуральна, ён размяшчацца не мог) няма ніякіх археалагічных сведчанняў, хаця стратыграфія культурнага пласта на тэрыторыі і вакол манастыра намі была даследавана. Княжацкі двор, вядомы па пісьмовых крыніцах XIV–XVI стст., мог існаваць дзесці на берагах ракі Бельчыцы [2, с. 71].

У свеце аналізу наяўных дакументаў становіцца відавочным, што “няўлоўны” для археолагаў мужчынскі Багародзіцкі манастыр, заснаваны Еўфрасінняй ў XII ст., і манастыр на Бельчыцы, даследаваны археалагічна і шырока вядомы ў пісьмовых крыніцах XVI–XVII стст. пад назвамі “Барысаглеб” “Глеба-Барыса”, а таксама “Прачыстай Божай Мацеры і Святых пакутнікаў Барыса і Глеба”, з’яўляюцца адным і тым жа.

ЛІТАРАТУРА

1. Алексеев, Л.В. Западные земли домонгольской Руси : очерки истории, археологии, культуры : в 2 кн. Кн. 2./ Л.В. Алексеев ; Ин-т археологии РАН. – М. : Наука, 2006. – 167 с.
2. Варонін, В.А. Чарсцвяды: ад двара княскага да двара гаспадарскага / В.А. Варонін // Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі : матэрыялы VI міжнар. навук. канф., Полацк, 1–3 ліст. 2012 г. : у 2 ч. / НПГКМЗ. – Полацк 2013. – Ч. 1. – С. 68–74.
3. Залилов, И.З. О датировке архитектурных памятников Полоцка XI–XII веков / И.З. Залилов // Вестн. Полоц. гос ун-та. Серия А. Гуманитарные науки. – 2015. – № 9. – С. 127–134.
4. Историко-юридические материалы, извлечённые из актовых книг губерний Витебской и Могилёвской, хранящиеся в Центральном архиве в Витебске и изданные под редакцией архивариуса сего архива Сазонова. – Витебск : Тип. Губ. правл., 1871. – Вып. 2. – 382 с.
5. Кніга жыцій і хаджэнняў : пер. са старажытнарус., старабеларус. і польск. / уклад., прадм. і каментарый А. Мельнікава. – Мінск : Маст. літ., 1994. – 503 с. [16] л. іл.
6. Полоцкие грамоты XIII – начала XVI в. : в 6 вып. Вып. 2 / Акад. наук СССР. Ин-т истории СССР. – М., 1977 – 1989 / сост. А.Л. Хорошкевич. – 1978. – 220 с.

7. Полоцкие грамоты XIII – начала XVI в. : в 6 вып. Вып. 3 / Акад. наук СССР. Ин-т истории СССР. – М., 1977 – 1989 / сост. А.Л. Хорошкевич. – 1980. – 214 с.
8. Раппопорт, П.А., Полоцкое зодчество XII века / П.А. Раппопорт // СА. – 1980. – № 3. – С. 143–163.
9. Селицкий, А.А. Живопись Полоцкой земли XI – XII вв./ А.А. Селицкий – Мінск : Навука і тэхніка, 1992. – 173 с.: ил.
10. Скарга полацкага архіепіскапа Іасафата Кунцэвіча на паноў Корсакаў аб тым, што яны бяспраўна назваліся заснавальнікамі Барысаглебскага манастыра і прыўласцілі яго землеўладанні / падрыхтаваў да друку Ю.М. Мікульскі // Беларуская даўніна: Гістарычны альманах. – Мінск : Выдавец А.М. Вараскін, 2015. – Вып. 2. – С. 232–234.

## THE MYSTERY OF MISSING SHRINES: MONASTERIES OF THE HOLY VIRGIN IN POLOTSK

***D. DUK***

*The answer to the question about placement based Euphrosyne of Polotsk in the XII century male Mother of God Monastery is proposed. It has been suggested that Boris and Gleb Monastery on Belchitsy, commonly known in written sources of XII-XVIII centuries., and the mysterious monastery in honor of St. Virgin, founded in Polotsk by St. Euphrosyne in the XII century., are one and the same.*